ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 190 (1157) | ПАНЯДЗЕЛАК, 18-га жніўня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

СУРОВА КАРАЦЬ ЗАЦІСКАЧОЎ САМАКРЫТЫКІ

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач соцыялістычнага будаўніцтва, якое праходзіць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы немагчыма без разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі. Разгортваючы шырокую хвалю самакрытыкі, узьнімаючы ярасьць мас на барацьбу са шкодніцтвам, бюрократызмам, безгаспадарчасьцю, рашуча змагаючыся з адхіленьнямі ад генеральнай лініі партыі, у першую чаргу з правым ухілам і прымірэнцтвам да яго,—мы забясьпечылі магчымасьць пасьпяховага выкананьня нашых плянаў.

Вастрыём самакрытыкі, метка б'ючы па бюрократызму, паганіне, чыноўніцтву—працоўныя масы паляпшаюць працу нашага апарату, выкарчоўваючы усё непатрэбнае, гнілое.

Са зброяй самакрытыкі мільённая армія корэспондэнтаў выводзіць на „чыстую ваду“ шкоднікаў, галавацяпаў, безгаспадарнікаў, ухілістых, клясавых ворагаў, усіх тых, хто прысасаўшыся да савецкага, партыйнага, комсамольскага цела, скрыўляючы партыйную лінію, адарваўшыся ад мас, шкодзіць соцыялістычнаму будаўніцтву.

Зусім зразумела адсюль, што той, хто не садзейнічае разгортваньню самакрытыкі, і тым больш хто заціскае самакрытыку, становіцца на варожы соцыялістычнаму будаўніцтву шлях.

Матар'ялы, якія мы сёньня друкуем, з асаблівай яскравасьцю аб гэтым сьведчаць. Яны паказваюць, як кулацкі „паўпрэд“ у партыі, пралезшы да кіраўніцтва кандыдацкай групай КП(б)Б, знаходзячыся ў палоне кулака і папа разам і на чале цэлай кампаніі варожых людзей, прыкрываючыся парт. білетам на працягу доўгага часу тварыў свае ганебныя справы,—заціскаў самакрытыку, цкаваў юнкора Ракіту.

Справа юнкора Ракіты зьяўляецца лепшым прыкладам таго, як кулацка-папоўскія элементы, вядучы работу па зрыву соцбудаўніцтва, пад час скарыстоўваюць людзей з парт. білетамі ў якасьці свайго рупару.

Справа Ракіты з усёй відавочнасьцю паказвае, як комсамольскі камітэт, не разумеючы сутнасьці самакрытыкі з прычыны палітычнай тупасьці, об'ектыўна стаў на бок клясава-варожых элементаў, садзейнічаў заціску самакрытыкі.

Цкаваньне юнкора Ракіты дашло да такой ступені толькі дзякуючы таму, што шэраг дапісаў юнкора, злачынна ігнараваўся людзьмі, якія ня любяць самакрытыкі. Гэты факт заслугоўвае асаблівай увагі таму, што ён не адзіны, таму, што і па сёньня яшчэ ў шэрагу месц не ажыцьцяўляецца пастанова ЦК КП(б)Б аб тым, што „ва ўсіх выпадках сыстэматычнага ігнараваньня рабселькораўскіх заметак, ці «абвяржэньня» прыцягваць да судовай адказнасьці, як за злачынства, вінаватых у ігнараваньні, фармальных і бюрократычных адносінах да крытыкі ў друку“.

У даным выпадку характэрна, што сэкратар РВК—Бохан, які ў свой час заметку Ракіты аб дзеяньні сэкратара кандыдацкай групы перадаў яму-ж утварыць расьсьледваньне, (?!)—да гэтага часу ня прыцягнуты да судовай адказнасьці.

Справа Ракіты павінна паслужыць палітычным урокам у першую чаргу для комсамольскай арганізацыі.

Комсамольскія камітэты, ячэйкі, групы „Л. К.“ абавязаны сачыць за тым, каб юнкораўскія заметкі выкрываючага характару сустракалі хуткае рэагаваньне з боку адпаведных арганізацый.

Выкрываючы і б'ючы заціскачоў самакрытыкі, якія льлюць ваду на млын клясавага ворага, об'ектыўна садзейнічаюць кулаку, шкодніку, бюрократу ў іх надрыўнай рабоце,—камітэты і ячэйкі абавязаны ўсімі мерамі садзейнічаць разгортваньню самакрытыкі як па-за саюзам, так і ў саюзе, памятаючы, што разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі ёсьць неабходная ўмова для пасьпяховай барацьбы з клясавымі ворагамі і яго агентамі—правымі ўхілістамі ўнутры партыі і комсамолу.

Трэба дабіцца як мага хутчэйшага ажыцьцяўленьня пастановы ЦК КП(б)Б „аб узмацненьні рэагаваньня на крытыку ў друку і насьценгазэтах“, асабліва завастраючы ўвагу на тым, **„што няўважлівыя адносіны да рэагаваньня на рабселькораўскія заметкі і зьмяшчэньне ў адказ беспадстаўных абвяржэньняў павінны разглядацца, як самая пэўная адзнака загніваньня апарату, бо гэта паказвае, што ў даным апарацэ бюрократычныя скажэньні прыдушаюць сабой ініцыятыву ў галіне зьнішчэньня недахопаў“.**

Сваечасовае рэагаваньне на доніс, хуткае зьнішчэньне паказаных у дапісе ненормальнасьцяй будзе яшчэ больш стымуляваць разгортваньне самакрытыкі, павялічваць і клясава загартоўваць армію юнкораў, дасьць магчымасьць папярэджваць ганебныя факты гавеньня на юнкораў і заціск самакрытыкі.

Гамбургскі порт на асадным становішчы

БЭРЛІН 16.—Забастоўка партавых рабочых у Гамбурзе усё больш абастраецца. У порце абвешчана асаднае становішча. Усе набярэжныя заняты паліцэйскімі атрадамі, якія бязьлітасна разганяюць зьбіраючыяся групы бастуючых.

У Дуйзбурзе (Рэйнская вобласьць) партавыя рабочыя забаставалі у другі раз, з прычыны парушэньня адміністрацыяй абавязацельства аб прыёме раней звольненых рабочых. Забастоўка вядзецца пад кіраўніцтвам рэволюцыйнай профопозыцыі. На ткацкай фабрыцы ў Апольдзе (Цюрынгіі) адміністрацыя прымушана была адмовіцца ад патрабаваньня аб зьніжэньні зарплаты, з прычыны упартай забастоўкі ткачоў, якая праходзіць пад кіраўніцтвам рэволюцыйнай профопозыцыі.

Кітай

Гэроічная барацьба чырвоных

ШАНХАЙ, 16.—Увесь паўночны ўсход правінцыі Хунань ахоплен барацьбой чырвоных супроць урадавых войск і бандаў паноў.

Чуткі аб заняцьці Чанша чырвонымі войскамі упарта распаўсюджваюцца, па-першае—паўночанцамі—для падрыву даверра к Нанкіну і,—па другое—прадстаўнікамі імпэрыялістычных дзяржаў, каб апраўдаць сьцягваньне вялікіх сіл каля Чанша. Па некаторых вестках, гэтыя сілы імпэрыялістых прымалі рашаючы ўдзел у выгнаньні з Чанша чырвоных атрадаў.

Хто вінаваты ў зрыве?

ЦК ЛКСМБ і рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“, сумесна з арганізацыямі, зацікаўленымі ў правядзеньні колгасна-вытворчага паходу комсамолу, 17 жніўня праводзілі нараду.

Ня гледзячы на сваечасовае паведамленьне праз газэту і ЦК, кіраўнікі паасобных арганізацый не зьявіліся на нараду. Белколгасцэнтр, Малжывёлаводсаюз, Сьвінатрэст, Палляводсаюз, ЦСПСБ, Наркамасьветы і сэкратары Менгаррайкому ЛКСМБ сарвалі працу нарады.

Мы настойліва патрабуем ад адпаведных органаў прыняць меры да вінаваных у зрыве нарады.

Найдзейнае прыстанішча соцыял-здраднікаў

Пусьцеце мяне да вас!.. Я не хачу з ім больш мець справы...

Забастоўка разрастаецца

ПАРЫЖ, 12. Забастоўка протэсту супроць закону аб соцыяльным страхаваньні на поўначы Францыі ўсё разрастаецца.

Рэформістыя заклікалі рабочых усіх прадпрыемстваў, уласьнікі якіх пайшлі на ўступкі, аднавіць работу з 11 жніўня.

Згодна паведамленьняў буржуазных газэт, зьявілася на работу з агульнага ліку 160000 бастуючых, каля 3000 тэкстыльшчыкаў і каля 1000 мэталістых.

Ліст-тэлеграма

Усім сакратарам Райкому КП(б)Б

Уборачная і пасеўная кампаніі праходзяць зусім нездавальняюча.

Раённыя партыйныя камітэты і ячэйкі ня прыдалі дастатковага значэньня і ня прынялі неабходных захадаў, забясьпечваючых сваечасовае і поўнае выкананьне пастаўленых задач партыяй. ЦК КП(б)Б катэгарычна прапануе безадкладна мобілізаваць усе сілы і шырока арганізаваць дапамогу з боку савгасаў, колгасаў, скончыўшых збор ураджаю колгасам і паасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам.

Скарыстайце ў поўнай меры машыны савгасаў, колгасаў для дапамогі індывідуальным гаспадаркам у справе ўборкі, абмалоту і сяўбе.

Організуйце соцспаборніцтва і ўдарніцтва, рабочыя брыгады савгасаў і колгасаў навакол лёзунгу: „Ніводнага гэктару няўбранага і незасеянага не павінна застацца“.

Разгарніце на падставе правядзеньня кампаніі масавае ўваходжаньне бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у існуючыя і ўноў організуемыя колгасы.

Устанавіце пэрсанальную адказнасьць за выкананьне вытворчых заданьняў кіруючымі зямельнымі, коопэрацыйнымі і савгаскімі працаўнікамі.

Устанавіце нагляд за сваечасовай і поўнай інформацыяй аб ходзе кампаніі Наркамзем.

ЦК КПБ апошні раз папярэджвае, што нявыкананьне вытворчых заданьняў кампаніі, няпрыняцьце захадаў па мобілізацыі шырокіх мас пацягне за сабой прыцягненьне вінаватых да партыйнай адказнасьці.

Мобілізаваных на ўборачную кампанію заставіць на месцах да асобнага распараджэньня ЦК.

За Сакратара ЦК КП(б)Б ГАНТМАН.

Індыйскія масы не адступяць!

ПАЎСТАЮЦЬ НОВЫЯ ПЛЯМЁНЫ

„Цьвёрдалобыя“ ізноў знаходзяць „маскоўскую руку“

ЛЁНДАН, 16. У турме, у Пуне, працягваюцца перагаворы паміж лідэрамі ўсеіндыйскага нацыянальнага конгрэсу. Вайсковы савет нацыянальнага конгрэсу выпусьціў адозву, у якой заяўляе, што масы нязгодзяцца ні на якое скарачэньне програмы сваіх дзеяньняў і не на якае адступленьне ад лёзунгаў, з якімі яны выступалі ў барацьбе за свае правы.

Законадаўчы сход Бэнгаліі ў Калькуце, пасьля рэзкіх супярэчнасьцяй, прыняў большасьцю ўсяго 2 галасоў прапанову провінцыйнага ўраду аб дадатковым водпуску сродкаў на барацьбу з кампаніяй непавінаваньня. Прыхільнікі ўсеіндыйскага конгрэсу ў пасяджэньні ня ўдзельнічалі. У Бэнгаліі, Пенджабе і іншых індыйскіх провінцыях вышэйшыя паліцэйскія і судовыя чыноўнікі атрымалі ад імя „індустанскай соцыялістычнай рэспублікансьай арміі“ лісты, у якіх пагражаюць ім сьмерцю.

ЛЁНДАН, 16. Працягваецца перакідваньне войскаў з другіх провінцый Індыі ў раён паўстаньня на Паўночна-заходняй граніцы. Афрыды мобілізуюць новыя сілы сярод мамандаў і іншых плямён. Чыгуначныя зносіны падтрымоўваюцца пад аховай бронягягнікоў і бранявікоў.

Афрыды, дзейнічаючы ў згодзе з усеіндыйскім нацыянальным конгрэсам, хаця конгрэс і не адабрае мэтадаў, якія прыстасоўваюцца паўстаўшымі. Паміж іншым, афрыды патрабуюць вызваленьня Гандзі. Газэты ангельскіх цьвёрдалобых, абгаварываючы становішча ў Паўночна-Заходняй правінцыі Індыі, вядуць паклёпніцкую кампанію супроць СССР.

Комбінацыя з пальцаў

Буржуазная прэса страпае новую провокацыю. Француская газэта „Тан“ паведамляе, быццам у Кітаі бандыты адрэзалі адзін палец місіонэрцы Нэтльтон і патрабуюць выкуп у 5 тыс. фунтаў стэрлінгаў. Ангельская газэта „Тан“ піша, што бандыты адрэзалі ў міс Нэтльтон некалькі пальцаў і патрабуюць выкуп у 50.000 фунтаў стэрлінгаў. Ці не зразумела, што гэтая провокацыя, накіраваная супроць рабочых і сялян Кітаю, шыта белымі ніткамі?

Італія ў баку ад „антысавецкай гістэрыкі“

РЫМ, 16. Адказваючы на выпады францускага друку, па поваду савецка-італьянскай згоды, італьянскія газэты пішуць, што Італія ня мела, ня мае і ня будзе мець нічога агульнага з «антысавецкай гістэрыкай некаторых дзяржаў».

Па словах газэт, Італія ўвесь час лічыла, і працягвае лічыць, нікуды няварты жаданьне „выключыць хаця-б часова расейскі фактар з эўропейскай палітыкі“.

Газэты дадаюць, што Італія „не зварачвае ўвагі на ўсе тыя сьмяхотныя байкі, якія ўзьнікаюць час ад часу і служаць повадам для складаньня блёкаў супроць СССР“.

Комсамольскія ячэйкі, упаўнаважаныя „Чырв. Зьмены“!

Паклапаціцеся аб сваячасовым забясьпечаньні комсамольцаў „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНАЙ“ ДА X-га ЗЬЕЗДУ комсамолу Беларусі

„Фронт гародніны—вучастак клясавай барацьбы“

ГОМЕЛЬ ПАБІУ РЭКОРД БЕЗАДКАЗНАСЬЦІ

Галавацяпы з Гомельскага ЦРК паставілі бюрократычны крыж над забясьпечаньнем рабочых гароднінай

Акругкамол не мобілізаваў масу комсамольцаў на сустрэчу гародніны

Мы патрабуем ад Гомельскай АКК РСІ выратаваць гародніну з бюрократычных кіпцюроў ГЦРК

АК ЛКСМБ павінен нарэшце заняцца справаю організацыі сустрэчы гародніны і забесьпячэньнем ёю рабочага спажыўца

Комсамол ня мае права бязьдзейнічаць на фронце загатоўкі гародніны

Вырашэньне проблемы рабочага забясьпечаньня і павышэньня рэальнай заралаты непарыўна зьвязана з вырашэньнем проблемы гародніны. Але пагражаючае становішча з нарыхтоўкамі гародніны паказвае, што асноўныя загатоўчыя організацыі Белсаюзплодгародніна, Белкопсаюз і Цэрабкоопы яшчэ да апошняга часу не уразумелі політычнага зьместу гэтай проблемы, што яскрава адлюстроўваецца менскімі, гомельскімі і мазырскімі прарывамі ў нарыхтоўках гародніны.

Леташнія памылкі паўтараюцца амаль ва ўсіх загатоўцаў. Скляпы для хаваньня гародніны сваечасова не адбудаваны. Тара не падрыхтавана. Транспарт не наладжан, не арганізавана дастаўка гародніны рабочаму на дом.

Кіраўнікі кооперацыйных загатоўчых організацый знаходзяцца ў палоне казённага благадушша.

Комсамольскія організацыі, і ў першую чаргу камітэты забыліся, што **«фронт гародніны зараз—гэта буйнейшы вучастак клясавай барацьбы"**, не пачулі заклiку ЦК УсеЛКСМ аб мобілізацыі актыўнасьці і энтузіязму комсамольскіх мас на выкананьне важнейшай політычнай задачы, настаўленай партыяй.

Акруговыя камітэты Менску, Гомелю і Мазыру з злачыннай безадказнасьцю адносіліся ўвесь час да заклікаў «Чырвонай Зьмены" аб ліквідацыі прарываў на гароднінным фронце.

Ні адзін камітэт, ні адзін комсамольскі колектыў ня даў прыкладу бальшавіцкай сустрэчы гародніны. Затое ганебных прыкладаў можна прывесьці шмат.

Комсамольскія колектывы чыгуначнікаў і транспартнікаў на адкрыты ліст комсамольцаў МЦРК аб організацыі кантролю над перавозкай гародніны адказалі дэмонстрацыйнай бязьдзейнасьцю і маўклівасьцю.

Зараз, калі наша краіна, напружыўшы ўсе мускулы свайго організму, з бальшавіцкай упартасьцю змагаецца за хутчэйшае вырашэньне харчовай проблемы, у сыстэме якой гародніна зьяўляецца адным з важнейшых зьвеньняў,—бязьдзейнасьць комсамолу ёсьць ганебнае злачынства.

ЦК ЛКСМБ павінен ужо зараз зрабіць адпаведныя вывады ў адносінах да тых, хто сваёй бязьдзейнасьцю зрывае выкананьне важнейшых задач, што стаяць перад краінай.

Гародніна чакае дапамогі ад комсамолу, яна патрабуе бальшавіцкай сустрэчы.

Гэту сустрэчу нарэшце павінен організаваць комсамол.

Паўтараюць Менскія прарывы

Менскія прарывы у нарыхтоўках гародніны, аб якіх шмат пісала ўжо „Чырвоная Зьмена", павінны былі-б стаць папераджаючым трывожным сыгналам для ўсіх загатоўцаў гародніны ў іншых акругах Беларусі. Але з апошніх вестак некаторых акруг відаць, што ня ўсе загатоўцы гародніны прыслухоўваліся да сыгналаў „Чырвоназьменаўскіх" брыгад. Памылкі Менску з яшчэ больш абураючым галавацяпствам паўтарыліся ў шэрагу іншых акруг.

Характэрна, што амаль ва ўсіх акругах асабліва балючым „вузкім месцам" у гародніна-нарыхтоўках зьяўляецца несваечасовая падрыхтоўка адпаведных памяшканьняў для хаваньня гародніны.

„Кожны раз на гэтым самым месцы"

У Гомелі пабудова скляпоў для гародніны пачалася ў 1929 годзе і дагэтуль яшчэ ня скончана. Частку ўжо адбудаваных скляпоў нельга скарыстаць для хаваньня гародніны, бо яны пабудаваны па прынцыпу... жылых дамоў (?). Гэты казус гомельскія бюрократы з ЦРК заўважылі толькі тады, калі абозы з бульбаю стаялі ўжо каля скляпоў.

Нельга гаварыць без абурэньня аб тэй выключнай безадказнасьці з якой работнікі ГЦРК адносяцца да будаўніцтва такіх скляпоў. Ужываюцца старыя прагніўшыя дошкі, з ажаныя грыбком. У выцяжных комінах пакінуты вялікія шчыліны, праз якія пападае ў скляпы вада і сьнег. Ужо зараз скляпы настолькі насычаны вільгацьцю што хаваньне там гародніны немагчыма бяз рызыкі напалову згнаіць яе. Дзьверы і окны не абіты войлакам, сьцены не пабелены.

20 вагонаў гародніны, якая паступіла на базу Гомельскага Цэрабкоопу, ужо больш тыдня валяецца пад адкрытым небам у мяхах. Гародніна гніе і псуе тару. Каб выйсьці з дрэннага становішча ЦРК рассылае папсаваную гародніну па крамах для „рэалізацыі" яе.

Сетка гародніных крам зусім недастарчальна. У цэнтры гораду усяго толькі 4 крамы. Рабочыя акраіны гароднінай не забясьпечваюцца. Крамы не прыстасаваны для хаваньня гародніны. Паляжаўшы ў краме 2-3 дні яна пачынае гніць.

Зачыненыя з-за адсутнасьці мяса мясныя крамы не выкарыстоўваюцца для продажу гародніны.

Бюрократычны „крыж" над рабочым забясьпечаньнем

Падрыхтоўчай працы па дастаўцы рабочаму гародніны на дом не вядзецца. Адносіны работнікаў Цэрабкопу да гэтай справы — напляв...цельскія. Напрыклад, адказны працаўнік с-г аддзелу ГЦРК—Міцько, заяўляе:— „На дастаўку гародніны на дом трэба паставіць крыж". Так гомельскія бюрократы чыноўнічым крыжам перакрэсьліваюць дырэктывы партыі аб рабочым забясьпечаньні, а потым з пенаю ў рта даводзяць што ўсяму віною „об'ектыўныя прычыны".

ЦРК зусім не падрыхтаваўся да сустрэчы чырвоных абозаў гародніны. Няма адпаведнага штату, памяшканьняў вагі і інш.

Безгаспадарнасьць ці шкодніцтва?

У савгасе ЦРК безгаспадарнасьць даходзіць проста да шкодніцтва. Савгасны сад страшэнна запушчаны відаць таму, што ў савгасе сядзяць аж 3 аграномы. Ураджай гароху, невядома па якіх прычынах быў зьняты з поля нясьпелым і зараз гніе на базе Цэрабкопу. Рабочая сіла ня гледзячы на вострыя недахоп скарыстоўваецца нерацыянальна. Там дзе з посьпехам могуць выканаць працу 1—2 чалавекі працуе 5—6 чалавек. Работа не пераведзена на зьдзельшчыну. Сярод сэзонных рабочых шырока распаўсюджана лодырства і сымулянства.

Плады працы коопэрацыйных „фруктаў"

На паваду у прыватніка

Справаздача ў савгасе адстае на два месяцы і немагчыма ні выявіць кошт продукцыі ні зрабіць адпаведную калькуляцыю. Продажныя цэны на гародніну вызначаюцца як каму ўздумаецца. Замест таго, каб сваімі цьвёрдымі цэнамі ўплываць на прыватны рынак, Цэрабкоп сам ідзе на поваду ў прыватніка, раўняючыся з цэнамі вольнага рынку.

Вось невялічкі нарыс гародніных нарыхтовак па Гомельшчыне. Ён паказвае, як Гомельскі ЦРК „уключыўся" ва ўсесаюзную сустрэчу гародніны.

Рэчыца „раўняецца" па Гомелю

Каб не пакрыўдзіць бліжэйшага суседа Гомельшчыны— Рэчыцу, ... сказаць некалькі слоў і аб Рэчыцкіх загатоўцах гародніны.

Аб іх коратка, але досыць выразна і чотка, запісаў у сваіх вывадах ... гадзір ЦК ЛКСМБ т. Розін, які ... сьледаваў становішча нарыхтоўкі гародніны па акрузе.

„Пабудова гародніна-хавальняў ... чарапашым тэмпам. Нават дагэтуль ... няма яшчэ распляноўкі месц, ... віны быць пабудаваны скляпы. ... кіраўніцтва пабудовою скляпоў ... пагроза, што скляпы сёлета ... ваны ня будуць. Гароднінная б... гэтуль яшчэ не організавана. Я... вызначан працаўнік, які-б адказ... нарыхтоўку гародніны. Вось ... горадзе ўжо зараз досыць адчу... востры недахоп бульбы і агурк... Забясьпечаньне рабочых спаж... гароднінай сёлета будзе сарвана".

Комэнтарыяў непатрэбна. Факты ... вораць самі за сябе.

Дзе быў комсамол?

Нас цікавіць, дзе быў увесь ... Гомельскі і Рэчыцкі комсамол? ... ён заклік ЦК УсеЛКСМ, ЦК Л... „Комсамольскай Праўды" і ... най Зьмены" аб організацыі ўсе... най сустрэчы гародніны?

Якім чынам здарылася, што ... лепшых атрадаў ЛКСМБ—Гом... комсамол з такой злачыннай ... насьцю аднёсься да важнейшай ... тычнай задачы, якая вырашае ... альнейшую проблему сучасно... проблему рабочага забясьпеча... павышэньня рэальнай зарплаты ... бочых?

Ударнымі тэмпамі ліквідаваць прарывы

„Чырвоная Зьмена" на сваіх ... ронках жорстка крытыкавала ... мольскія організацыі Менску, ... і Слуцку за прарывы на гар... фронце. Чаму гэта не паслужы... рокам для кіраўнікоў Комсамолу ... мелю і Рэчыцы?

На гэта запытаньне мы чакаем ... міновага адказу.

Мы патрабуем ад комсамольскіх ... ганізацыі і ў першую чаргу ад ... ніцтва Гомелю і Рэчыцы безадк... кінуць лепшыя сілы комсамолу ... фронт гародніны, і ўдарнай пр... ліквідацыі ўжо створаных пр... уключыць сваю актыўнасьць і ... тыву на выкананьне чарговай ... па таўленай партыяй перад ...

Н. ...

„Людзі ня сьвіньні—усё паядуць"

Вельмі часта можна пачуць скаргі рабочых спажыўцоў на надзвычайна дрэнную якасьць гародніны, якая прадаецца ў крамах МЦРК і прымушае спажыўцоў купляць гародніну ў прыватніка.

Аб гэтым добра ведаюць работнікі МЦРК і... працягваюць завальваць гнільлю гародніныя крамы.

15-га жніўня ў краме № 182 (па Інтэрнацыянальнай вуліцы), ня гледзячы на протэсты загадчыка крамы, выгрузілі 900 кілёграм гнілых гуркоў, прысланых з гароднінай базы МЦРК. Прысутныя ў краме спажыўцы былі надзвычайна абураны гэтым фактам і катэгарычна адмовіліся купляць гніль.

Тае самае адбылося і ў краме № 205, куды прывезьлі 10 мяхоў папсаваных гуркоў. Гэтыя абураючыя факты не зьяўляюцца выпадковымі. База ЦРК трымае гародніну пакуль яна не пачне псавацца і толькі потым рассылае яе па крамах. Так было з бульбаю, гуркамі і памідорамі.

Праўленьне МЦРК павінна прыцягнуць да адказнасьці тых, хто хоча накарміць рабочых гнільлю, хто лічыць, што людзі ня сьвіньні —усё паядуць.

Трэба спыніць зьдзек над рабочым спажыўцом.

Загадчык крамы.

„Ядуць вачыма начальства" і... кормяць маслам

У Рэчыцкай сталовай № 3 устаноўлены своеасаблівы прынцып разьмеркаваньня дэфіцытных продуктаў. Рабочых кормяць поснаю пахлёбкаю і бульбай, а як толькі зьяўляюцца ў сталоўку „сам" прадстаўнік крымвышуку — Маневіч, альбо адказны працаўнік банку— Кажамакін, адкуль што бярэцца— для іх адразу паяўляецца і сьлівачнае масла, і галяндэрскі сыр і мяса. Гэтыя продукты адпушчаюцца начальству бяз усялякіх норм і чаргі. Бязумоўна, адміністрацыя сталоўкі не забывае і пра сябе. „Самазабясьпечаньне" пастаўлена добра.

Рабочыя Рэчыцы патрабуюць прыцягнуць да адказнасьці намесьніка загадчыка сталоўкі—Куракіну, з дазволу якое ўсё гэта робіцца і ўстанавіць сталы кантроль над разьмеркаваньнем дэфіцытных продуктаў.

Р.

Рашэньні XVI зьезду УсеКП(б)—у масы!

Не паслабляць барацьбы з правым ухілам

Ад лідэраў правага ўхілу XVI зьезд партыі чакаў яснага, чоткага безагаворачнага і шчырага прызнаньня сваіх памылак. І ня толькі гэтага... Зьезд партыі чакаў пачуць ад правадыроў правай апозыцыі правільнай бальшавіцкай характарыстыкі той політыкі, той програмы, тых ідэй (гэта значыць права-опортуністычнай політыкі, права-опортуністычнай програмы, права-опортуністычных ідэй), якія імі абараняліся доўгі час. Для зьезду важна было пачуць не формальнае прызнаньне зробленых памылак. Гэта формальнае прызнаньне было зроблена яшчэ ў лістападзе 1929 году.

Зьезд чакаў ня прыгожых прамоў, пакаяньня і самабічаваньня. Зьезд хацеў даведацца перш за ўсё і раней за ўсё наступнае: ці зразумелі правадыры правай опозыцыі да канца ўсю антыленінскую сутнасьць правага ўхілу, ці да канца яны прадумалі контр-рэволюцыйны характар правага ўхілу, ці дастаткова ясна яны бачаць кулацкую сутнасьць ідэолёгіі правага ўхілу, ці дастаткова цьвёрда яны ўцямілі непазьбежнасьць таго шляху, шляху да перамогі капіталізму, на які прышла-б наша краіна ў выпадку ажыцьцяўленьня права-ухілісцкай програмы.

Зьезд чакаў ня новых дэклярацый, ён чакаў ясных нядвухсэнсных, часных бальшавіцкіх заяў аб памылках, ён патрабаваў правільнай характарыстыкі правага ўхілу, ён патрабаваў, каб правадыры правых не пакідалі ніякіх лазеек для новых выступленьняў супроць партыі.

Зьезд патрабаваў сапраўднага перакананўчага, але ня прымушанага разгромам правых, прызнаньня безумоўнай правільнасьці лініі Цэнтральнага Камітэту партыі, лініі партыі. Зьезд патрабаваў поўнага разброеньня правых, патрабаваў, каб правадыры правых канчаткова спалілі ўсе масты, якія злучаюць іх з опортуністычным мінулым.

Зьезд хацеў атрымаць цьвёрдую гарантыю, што правадыры правай опозыцыі пасьля зьезду будуць працаваць чэсна, шчыра, з поўным перакананьнем у правільнасьці ўзятай партыяй генэральнай лініі, будуць па-сапраўднаму разам з партыяй напружана працаваць над ажыцьцяўленьнем настаўленых перад краінай задач. І яшчэ аднаго жадаў зьезд ад правых правадыроў—гэта абавязацельства ня толькі прызнаньня сваіх памылак і антыпартыйнага характару правага ўхілу, але і абавязацельства актыўна змагацца супроць правага ўхілу. Выступленьне правадыроў правай опозыцыі не задаволіла зьезд. Дэлегаты зьезду дастаткова чотка выказалі гэтае незадаволеньне ў сваіх выступленьнях на зьезьдзе, у якіх палавінкавая позыцыя правадыроў правай опозыцыі падпарадкавалася заслужанай і бязьлітаснай крытыцы.

Зьезд партыі, ня гледзячы на нездавальняючасьць выступленьняў былых правадыроў правай опозыцыі, пакінуў іх у складзе Цэнтральнага Камітэту Партыі (... Угланава), зрабіўшы сур'... апошняе папярэджаньне. Сва... шэньнем зьезд партыі ў ... раз даў магчымасьці пра... правай опозыцыі давесьці ... в..., на практычнай рабоце, ... актыўнай барацьбе разам з п... супроць праваопортуністычн... мэнтаў, што яны разам з п... разам з усёй рабочай клясай ... ва ўпартай барацьбе будуе ... ялізм, перамагае ўсе цяжкас... часнага этапу будаўніцтва ... ялізму.

Зьезд партыі прыняў ... аб несумяшчальнасьці ... правага ўхілу з прабыва... шэрагах партыі.

Ці значыць гэта, што ... ўхіл ужо ліквідаваны? Б... не. Калі ў лістападзе 1929 ... лідэры правай опозыцыі аб... што яны адмаўляюцца ад ... праваўхілісцкіх поглядаў, ... юць іх няправільнымі (заява ... падаўскаму пленуму ЦК), ... пярэджваў супроць ацэнкі ... факту, як ліквідацыі правага ...

(Канец будзе)

„ДЫРЫЖЭРАУ АГЛАБЕЛЬ"—ДА АДКАЗНАСЬЦІ!

...Ты любишь криком убеждать
и дирижировать оглоблей..

Ал. Безыменский.

Прыкрываючыся партыйнымі білетамі, група кулацкіх подпявал Хутарскага с-с. (Чэрвеншчына), на чале з сэкратаром кандыдацкай партгрупы, скрыўляла клясавую лінію, сыстэматычна цкавала актыўнага юнкора Ракіту

... Эх, самокритику я так люблю,
Что рад-бы задушить ее в своих об'ятьях...

Ал. Безыменский.

Узброіўшыся бальшавіцкай самакрытыкай, юнкораўская армія яшчэ з большай энэргіяй і ўпартасьцю будзе выкрываць усіх шкоднікаў соцыялістычнага будаўніцтва

З сьвінапасаў—у настаўнікі

Юнкор Мікола Міцкевіч (М. Ракіта)—сын селяніна бедняка вёскі Юравічы, Хутарскога сельсавету, Чэрвеньскага раёну. На працягу 5-ці год ён батрачыў: тры гады сьвінапасам і два гады працаваў у кулакоў. З маладых год зарабляючы сабе кавалак хлеба, Міцкевіч увесь час імкнуўся да вучобы. Ня гледзячы на дрэннае эканамічнае становішча, дзякуючы настойлівасьці, Міцкевічу ўдаецца ў 1927 годзе скончыць Багушэвіцкую сямігодку. У 1925 годзе 16-гадовым хлапчуком Міцкевіч паступае ў шэрагі ленінскага комсамолу, пачынае прымаць актыўны ўдзел у рабоце хутарской ячэйкі, пісаць невялічкія крытычныя допісы ў насьценгазэту. У 1928-29 годзе ён праз газэту „ЗЬВЯЗДА" выкрывае хабарнікаў, п'яніцаў і г. д. На здаволіўшыся адукацыяй сямігодкі і ўлічваючы запатрабаваньні ў кадрах, Міцкевіч у 1928 годзе паступае на менскія 2-гадовыя пэдагогічныя курсы. Пасьля датэрміновага выпуску Міцкевіч камандыруецца ў Чэрвеньскі раён, дзе ўжо на працягу году працуе ў якасьці настаўніка пры Юраўскай аднакомплектнай школе. З гэтага часу ён становіцца сталым карэспондэнтам „Чырвонай Зьмены". Так з сьвінапаса вырас настаўнік, юнкор комсамолец.

Старое і новае

Зьвярнуўшыся пасьля вучобы на сваю бацькаўшчыну ў вёску Юравічы, Міцкевічу з першых дзён сваёй працы давялося сустрэцца з старым, рэакцыйна настроеным і варожым элемэнтам, які маецца сярод настаўніцтва Хутарскога сельсавету. „Гляздеце, хлопцы, каб ня зьелі тут гэтага комсамольца!"—такую заўвагу зрабіў адзін стары партыец. Але гэтага ніхто ня ўлічыў. Дзярновіч—сын высланага кулака, Сікорская—дачка былога валаснога пісара, Харлановічы (муж і жонка), якіх група беднаты абклала індывідуальна за эксплёатацыю двух батракоў, Панасенка, якому портрэты старых генэралаў куды цікавей, чымся портрэты рэволюцыйных правадыроў вось тая зграя „чорных воранаў", якія пачалі сыстэматычную атаку супроць комсамольца юнкора Міцкевіча. Міцкевіч з комсамольскай „дзёрзкасьцю" бічаваў у насьценгазэтах, у сваіх выступленьнях на раённай настаўніцкай конфэрэнцыі, тых, хто быў пасыўным у грамадзкім жыцьці, хто рабіў паасобныя памылкі. Асабліва яго агонь быў накіраваны супроць Панасенка і Сікорскай. Комсамолец ды яшчэ юнкор, які піша ў газэту, ім не спадабаўся. Ён закрануў самае балючае—іх рэакцыйнасьць, іх варожасьць. Яны паставілі сваёй мэтай аслабаніцца ад Міцкевіча. Старое ўжо гатова было адсьвяткаваць перамогу над маладым.

Хутарское галавакружэньне

Міцкевіч змагаўся ня толькі з рэакцыйна настроеным настаўніцтвам Міцкевіч рашуча выступаў супроць галявацяпаў, левых загібшчыкаў—саюзьнікаў правых, якія прымусам хацелі загнаць сераднякоў у колгас якія без усялякай растлумачальнай працы за некалькі дзён думалі колектывізаваць сельсавет на 100 проц. Хатнік Калтовіч заклікаў сялян да сябе ў габінэт і там пад пагрозай прымушаў іх ісьці ў колгас. Нарэйка—партыец—пужаў беднату:—„Табе тут ня месца, а трэба саслаць туды дзе чыбісы яйкі нясуць". Прадстаўнік з раёну Хасін ставіў пытаньне рубам: „Хто ня хоча ісьці ў колгас, той супроць Савецкай улады". Батрака Лапу выганяюць са сходу за тое, што ён выступіў супроць кулака Шута; батрака Новаша арыштоўваюць і накіроўваюць у міліцыю і г. д. Міцкевіч гаворыць, што так нельга праводзіць колектывізацыю. Ён піша допіс: „Хутарцы ня выпраўляюць, а паглыбляюць свае прарывы" („Ч. З." ад 15 красавіка), ён піша допіс: „Чэрвеньцы зрываюць пляны сяўбы" (ад 15 мая) і г. д. Сэкратар кандыдацкай партгрупы Калтовіч і партыец Нарэйка замест таго, каб успрыняць здаровую крытыку Міцкевіча становяцца на чале рэакцыйнай часткі настаўніцтва і сумесна з ёю падрыхтоўваюць першы ўдар па Міцкевічу—яны выключаюць яго з сяброў колгасу.

Дзе сабака зарыць?

Непасрэднай падставай для выключэньня зьявіўся сабака. Сьмешна,—але гэта сапраўды так. Міцкевіч, будучы членам саюзу паляўнічых, забіў брадзяжку сабаку. Настаўнік Панасенка і Сікорская скарыстоўваюць гэта і пачынаюць шаптаць вучням: „гэядзеце, што робіць настаўнік,—ходзіць і сабак страляе",—яны хацелі падарваць яго аўтарытэт перш усяго сярод дзяцей. Але гэта не канец. „Сабачая" справа пераносіцца на абгаварэньне колгасьнікаў. Раптоўна, на адным з чарговых сходаў, ставіцца пытаньне аб выключэньні Міцкевіча з колгасу. За што? За тое, што Міцкевіч забіў сабаку. Вялікую ролю ў апрацоўцы колгаснай масы супроць Міцкевіча адыгрываў загадчык фінчасткі Бярэзінскага РВК—Сікорскі, які гатоў быў жывым праглынуць Міцкевіча за тое што ён крытыкаваў яго жонку—настаўніцу Сікорскую. Сікорскі, зьяўляючыся фактычна ідэёвым кіраўніком па Хутарскім сельсавеце, меў свой уплыў на партгрупу, ячэйку КСМ, на колгас. Бядняцка-серадняцкая частка насельніцтва баялася яго, як агня. Затое кулакі яму спачувалі, бо Сікорскі сам для свайго цесьця—былога валаснога пісара—адбудаваў кулацкую гаспадарку. (Няхай прокуратура пацікавіцца, на якія сродкі адбудаваў сабе маёнтак пан Сікорскі). І вось гэты самы Сікорскі на колгасным сходзе, замест т а г о, каб падтрымаць Міцкевіча, к а б растлумачыць колгасьнікам, што задача кожнага паляўнічага біць брадзячых сабак, прыпёр яго да сьценкі і гаворыць: „Прызнай свае памылкі, прасі прабачэньня перад сходам за забой сабакі". Міцкевіч пры пасыўным маўчаньні Нарэйкі і іншых комуністых, выключаецца з колгасу. Непасрэдная прычына для выключэньня—сабака, але сапраўдны „сабака" закапаны ў крытыцы, у допісах Міцкевіча.

Блізарукі райком

Пасьля выключэньня з колгасу, Міцкевіч тут-жа піша заяву ў райком комсамолу. Хутарская ячэйка КСМ дасылае сваю пастанову аб няправільным выключэньні Міцкевіча, аб заціску самакрытыкі па Хутарскім сельсавеце і г. д. Райком маўчыць. Работнікі райкамолу—Красільшчык і Гантман—заявілі: „Міцкевіч—гультай. Міцкевіч нічога ня робіць у ячэйцы, Міцкевіч згубіў аўтарытэт сярод насельніцтва, мы яго думаем перакінуць у другую школу". Міцкевіч зьяўляецца членам бюро ячэйкі КСМ, Міцкевіч вывозіць на сваіх плячох амаль усю работу комсамольскай ячэйкі, Міцкевіч актыўны юнкор, а для Красільшчыка і Гантмана ён—гультай, Чэрвенскі райком КСМ у справе Міцкевіча праявіў політычную блізарукасьць. Работнікі райкому, замест рашучага рэагаваньня на заціск самакрытыкі па Хутарскім сельсавеце, замест выступленьня супроць цкавальнікаў юнкора, пашлі па лініі найменшага супраціўленьня—перакінулі Міцкевіча ў другі сельсавет.

Правая практыка

Комсамольскі райком маўчаў... А тымчасам старшыня колгасу—комунар Нарэйка—з кіруючай часткай наладжвае п'янку ў дзень сьвята 1 мая. Нарэйка зусім ня ведае што робіцца ў гаспадарцы. Догляд за жывёлай дрэнны, сьвіньні пачалі дохнуць. Захварэўшага кабана, каштоўнасьцю ў 500 рублёў, ня выклікаўшы вэтурача, прыстрэліў сам Нарэйка для скарыстаньня на мяса. Увесь маладняк гэтага году перарэзаны. Пашлі пад нож нават цяляты ад племянных кароў. Безгаспадарчасьць у колгасе дайшла да таго, што кароўім маслам пачалі колы мазаць,—гэта ў той час, калі рабочая кляса змагаецца за кожную унцыю тлушчаў. Кулацкая маёмасьць разбазарана, расьцягнута па хатах, некаторыя рэчы прысвоены комуністымі. Кулацкія сьвіньні ў ліку 9 штук разданы колгасьнікам у прыватнае карыстаньне, у тым ліку адну сьвіньню аддалі папу. Так па-сьвінску хутарскія злачынцы вырашаюць сьвіную проблему. Калтовіч, які стаяў на чале кандыдацкай партгрупы, ігнараваў работу сярод беднаты і батрацтва, ня вёў сярод іх політвыхаваўчай працы, ня ўцягваў у колгас, ня імкнуўся разьбіць існуючую думку, што бедната—гэта гультаі



„Плятформа" Калтовіча

„Папоўскі соцыялізм"

Замест с т а л а г а кіраўніцтва колгасам Калтовіч і Нарэйка змыкаліся з клясава-варожым элемэнтам. Яны пасялілі папа ў колгасным доме, далі яму агарод, далі кулацкую сьвіньню, гадзьдзіньнік, прынялі яго сям'ю на сэзонную працу ў колгас прызначыўшы самога папа конюхам. Нарэйка ўпарта настойваў дазволіць папу-пазбаўленцу прысутнічаць на колгасным сходзе. Беспартыйныя колгасьнікі галасуюць супроць, а комуністы Нарэйка—за. Калтовіч і Нарэйка тлумачаць сваё зрастаньне жаданьнем перавыхаваць папа. Калтовіч гаворыць: „Я імкнуўся вырваць дачок папа з-пад уплыву рэлігійнага дурману. Сям'я папа зьяўляецца ў нас прыкладнай рабочай сям'ёю у колгасе". Сакратар комсамольскай ячэйкі Качан становіцца ў абарону Калтовіча і гаворыць: „Наша задача—перавыхаваць пазбаўленцаў. Партыйцы маюць з імі сувязь для таго, каб перацягнуць іх на свой бок". Не комуністыя на папа, а поп на комуністых меў свой уплыў.

І гэта дало свае вынікі. Нядарма на колгасным сходзе можна было пачуць рэплікі: „Трэба ўсім жыць, як брат і сястра". Для Калтовіча і Нарэйкі адсутнічае клясавая барацьба. Для іх усе роўны, усе—браты і сёстры. Так хутарскія кіраўнікі будавалі „папоўскі соцыялізм".

Новая атака

Міцкевіч піша ў насьценгазэту допіс аб сувязі Нарэйкі з папом. Калтовіч, будучы рэдактарам газэты, кладзе гэты допіс пад сукно. Міцкевіч выкрывае на старонках „Чырвонай Зьмены" безгаспадарчасьць, якая існуе ў колгасе, ён гаворыць аб немагчымасьці разбазарваньня кулацкай маёмасьці, нарэшце ён шле допіс „Аб самакрытыцы забыліся" („Ч. З." № 113 ад 17-V). Сэкратар Чэрвеньскага РВК—Бохан, як тыпічны бюрократ, не паглядзеўшы ў чым справа, шле допіс на расьсьледаваньне самому Калтовічу. Калтовіч зьбірае актыў і не абгаварвае пытаньне як разгарнуць самакрытыку, а шукае таго, хто пісаў гэты допіс. Даведаўшыся, што і тут не абышлося без пяра Міцкевіча, Калтовіч і Нарэйка пачынаюць новую атаку на юнкора, ужо непасрэдна самі. Настаўнікі ўхікалі. Яны свайго дасягнулі,—справа цкаваньня з іх рук, з рук Сікорскага, пераходзіць у рукі комуністых, у рукі кулацкіх агентаў, якія пралезьлі ў шэрагі КП(б)Б. Пачынаецца бязьлітаснае цкаваньне. На нарадзе па адрасу Міцкевіча пасылаюцца самыя апошнія словы. Калтовіч крычыць: „Міцкевіч наводзіць мутату, імкнецца пісаць розную ерась і нябыліцу". Нарэйка яго падтрымоўвае і дадае: „Міцкевіч хоча дабіцца кар'еры, таму і піша ў газэту". Яны думалі запалохаць Міцкевіча, задушыць прабольскі крытычнага слова, прымусіць яго замаўчаць. Міцкевіч больш ня мог трываць. Ён зьвяртаецца з лістом да рэдакцыі, у якім гаворыцца: „Прашу адказаць, ці я хачу прабіць кар'еру, ці я дапамагаю будаўніцтву нашай краіны. Я думаю, што абавязак кожнага комсамольца чытаць і пісаць у „Чырвоную Зьмену" аб тых недахопах і дасягненьнях, якія мы маем. Але яны сваім штодзённым сьледзтвам супроць мяне склалі такія ўмовы, што далей жыцьцё немагчыма".

Выкрываючы справу хутарскіх душыцеляў самакрытыкі, нельга маўчаць і аб памылках самога юнкора.

Міцкевічу, ня гледзячы на яго выключэньне з колгасу, трэба было усё-ж пайсьці на талявыя работы ў колгас, дапамагчы у час уборачнай кампаніі—ён гэтага не зрабіў.

Улічыць хутарскія урокі

Справа Міцкевіча павінна быць улічана ўсімі партыйнымі і комсамольскімі організацыямі. Клясавы вораг ня сьпіць. Ён ціхай сапай, не шкадуючы самых брыдкіх прыёмаў і хітрыкаў імкнецца падарваць соцыялістычнае будаўніцтва. Кулацкія ідэолёгі і практыкі ў шэрагах КП(б)Б і КСМ будуць і ў далейшым імкнуцца сарваць колгаснае будаўніцтва на вёсцы. Душыцелі самакрытыкі будуць працягваць цкаваньне юнкораў. У адказ на гэта юнкораўская армія павінна з яшчэ большай настойлівасьцю і ўпартасьцю ўзяцца за выкрыцьцё правых і „левых" ухілістых, змагацца з бюрократамі, растратчыкамі, шкоднікамі, дапамагаючы партыі выканаць пяцігодку ў чатыры гады.

В. Воінаў.

ПАСТАНОВА

бюро Чэрвеньскага РК КП(б)Б па справе цкаваньня юнкора т. Міцкевіча

Заслухаўшы інформацыю тав. Воінава па справе цкаваньня юнкора „Чырвонай Зьмены" тав. Міцкевіча М. (М. Ракіты), члена ЛКСМБ Хутарскай ячэйкі,—бюро РК КП(б)Б констатуе, што з боку сэкратара кандыдацкай партыйнай групы тав. Калтовіча С. Я. і члена КП(б)Б тав. Нарэйкі мела месца:

Заціск самакрытыкі, які выразіўся ў тым, што за крытыку з боку т. Міцкевіча недахопаў у працы колгасу, кандыдацкай групы і большасьці настаўніцтва сельсавету было падрыхтавана выключэньне тав. Міцкевіча з колгасу «Комунар», прычым для гэтага былі выкарыстаны паасобныя памылкі т. Міцкевіча.

Што высьвятленьне допісу, зьмешчанага ў „Чырвонай Зьмене",—„Пра самакрытыку забыліся",—ператварылася ў цкаваньне т. Міцкевіча з боку сэкратара кандыдацкай групы КП(б)Б тав. Калтовіча і старшыні колгасу «Комунар»—члена КП(б)Б тав. Нарэйкі. Так, на нарадзе актыву, дзе высьвятляўся допіс, які цалкам падцьвердзіўся, Калтовіч заявіў:—„Міцкевіч наводзіць мутату, імкнецца пісаць розную ерась і нябыліцу", гэтыя словы падтрымліваў і тав. Нарэйка, дабаўляючы:—„Міцкевіч хоча дабіцца кар'еры і таму піша ў газэту".

Што тав. Калтовіч і Нарэйка ў сваёй працы скажалі клясавую лінію і трымалі сувязь з клясава-варожымі элемэнтамі. Так тав. Нарэйка на агульным сходзе колгасьнікаў упарта настойваў на дазволе прысутнічаць папу на колгасным сходзе; пры раздачы колгасных сьвіней была дана сьвіньня таксама і папу, што тав. Калтовіч і Нарэйка тлумачаць жаданьнем „перавыхаваць" папа.

Што тав. Калтовіч ігнараваў працу з батрацка-бядняцкай масай, чым праяўляў правы ўхіл на практыцы. У колгас бедната ня ўцягвалася. Політвыхаваўчае працы сярод батрацтва не вядзецца, праца груп беднаты пры сельсавеце зусім адсутнічае.

У працы колгасу „Комунар" дапушчан цэлы шэраг хваробных зьявішч: разбазарваньне кулацкай маёмасьці, адсутнасьць належнага догляду за жывёлай, беспадстаўная раздача 9 сьвіней (у тым ліку і папу), зьнішчэньне цялят (нават і ад племянных кароў), батракі і бедната колгасная ў органы кіраўніцтва гаспадарчым жыцьцём колгасу ня ўцягнуты. Кандыдацкая група КП(б)Б, на чале якой стаяў тав. Калтовіч, ведаючы аб усіх гэтых фактах, зусім на іх не рэагавала. Тав. Нарэйка—старшыня колгасу, ня ў курсе гаспадарчага жыцьця колгасу „Комунар", акрамя таго, тав. Нарэйка быў адным з ініцыятараў організацыі п'янкі кіруючай часткі колгасаў у дзень сьвята 1-га Мая.

Выходзячы з гэтага, бюро РК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Сэкратара кандыдацкай групы КП(б)Б пры Хутарскім сельсавеце, члена КП(б)Б з 1927 г., парт. білет № 1104710, селяніна-серадняка, які займае зараз пасаду загадчыка хутарскай хатай-чытальняй, меў суровую вымову ў бытнасьць старшынёю Вайнілаўскага сельсавету—**Калтовіча** Сяргея Язэпавіча за заціск самакрытыкі, цкаваньне юнкора „Чырвонай Зьмены" тав. Міцкевіча, скажэньне клясавай лініі і сувязь з варожым клясавым элемэнтам, ігнараваньне працы з батрацтвам і беднатой, чым праявіў правы ўхіл на практычнай рабоце, нерэагаваньне на хваробныя зьявішчы ў колгасе „Комунар" і г. д.—**выключыць з шэрагаў КП(б)Б.**

2. Члену КП(б)Б тав. **Нарэйка,** які садзейнічаў заціску самакрытыкі і цкаваньню юнкора тав. Міцкевіча, будучы старшынёй колгасу, фактычна не кіраваў ім, дзякуючы чаму дапусьціў безгаспадарнасьць, п'янства і г. д.—**абвясьціць суровую вымову.**

3. Тав. **Бохану**—сэкратару РВК, члену КП(б)Б з 20 году—за бюрократычны падыход да справы пры высьвятленьні допісу юнкора Міцкевіча—**паставіць на від.**

4. Папярэдзіць бюро РК ЛКСМБ аб несваечасовым рэагаваньні на заяву тав. Міцкевіча і пастанову агульнага сходу Хутарскай ячэйкі КСМ аб заціску самакрытыкі і няправільным выключэньні тав. Міцкевіча з колгасу.

5. Даручыць прокуратуры **тэрмінова зрабіць расьследваньне аб разбазарваньні кулацкай маёмасьці** і вінаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці.

6. Давесьці да ведама Бярэзінскага РВК аб паводзінах загадчыка фін. часткі Бярэзінскага РВК—**Сікорскага,** які, наведваючыся часта ў колгас „Комунар", таксама прымаў актыўны ўдзел у цкаваньні юнкора тав. Міцкевіча.

7. Даручыць фракцыі РВК абгаварыць пытаньне аб складзе настаўніцтва Хутарскага сельсавету, якое ў пераважнай большасьці прымала актыўны ўдзел у цкаваньні Міцкевіча і выключэньні яго з колгасу.

8. Для ўмацненьня партыйна-савецкай працы ў Хутарскім сельсавеце камандыраваць двух партыйцаў на сталую працу. Даручыць тав. Рай у пяцідзённы тэрмін падабраць кандыдатуры.

9. Даручыць члену бюро РК КП(б)Б тав. Баранчыку правесьці ў сувязі з гэтай пастановай растлумачальную працу сярод кандыдацкай групы, ячэйкі ЛКСМБ, у бядняцка-батрацкіх, серадняцкіх масах сялянства і колгасьнікаў Хутарскага сельсавету.

10. Правесьці растлумачэньне гэтай пастановы ва ўсіх партыйна-комсамольскіх ячэйках Чэрвеньскай організацыі.

11. Пастанову зьмясьціць у друку.

У бой за паперу

НАЧНЫ НАЛЁТ

Прапановы брыгады павінны быць праведзены ў жыцьцё

1 жніўня рэдакцыямі газэт «Палеская Праўда», „Чырвоная Зьмена“ і „Чырвоная Бракамолка“ быў арганізаваны рабкораўскі налёт на папяровую фабрыку «Гэрой Пр цы»

Што выяўлена?

Партыйна-профэсыйнае і комсамольскае кіраўніцтва на начной зьмене адсутнічае. Ня лепш справа і з адміністрацыйна-тэхнічным пэрсона ам. Дрэнна паст ўлена пажарна-міліцэйская ахова.

Брыгада выявіла цэлы шэраг фактаў нядб йных і безгаспадарчых ад осін да вытворчасьці, як з боку адміністрацыі, так і паасобных рабочых. Брыгада на грунце выяўленага вынесла шэраг каштоўных прапаноў.

Заводакіраўніцтва, партыйная, профэсыйная і комсамольская организацыі павінны забясьпечыць хутчэйшае правядзеньне іх у жыцьцё.

Што мы выкрылі?

У клейным аддзеле заданьні па прамфінпляну не адпавядаюць сапраўднасьці, патрабаваньні паперадзеьлу ў глиназеме ў два разы большыя, чым па заданьню. У бягуны для размолу браку рабочыя падаюць мала вады, зацягваючы гэтым процэс размолу, скарачаючы выпрацоўку.

У рольным аддзеле мала апрацаваная маса не праходзіць праз рэшата на сетку, выклікае астаноўку машыны, павялічвае колькасьць браку. Вада і бруд у рольным аддзяленьні разам з матар'ямі падаюць у ролікі. З машыны выходзіць засьмечаная папера.

Недахоп і адсутнасьць належнага догляду за вагонеткамі для падачы матар'ялаў робіць больш цяжкай падачу і павялічвае калецтвы.

На ролах першай машыны рабочая брыгада ня змазвае падшыпнікаў, падшыпнікі часта загараюцца.

Дзякуючы няўважлівым адносінам да работы з боку некаторы рабочых (Лопухаў), 2-я папермашына стала больш гадзіны.

3000 рублёў на вецер

Обэр-сетачнік і майстры не правяраюць форматаў на папермашынах. Так, на 1-й машыне, у брыгадзе сетачніка **Дзямукова В.** і **Васількова Р.**, выпрацавалі больш трох тон бюварнай паперы, форматам шырэй на 10 мэтраў, прышлося гэтыя абрэзкі пускаць назад у процэс апрацоўкі, прычым кілёграм бюварнай паперы каштуе 1 руб. 30 кап.

Фабрыка ад такой няўважлівасьці пацярпела страту каля 3000 рублёў. У 5-й машыне знасіліся асобныя часткі (кулакі). Для рамонту трэ' было спыніць машыну на 40 хвілін, але зьменны майстар **Уласенка** не дазволіў брыгадзе гэтага зрабіць.

Ва ўсіх аддзяленьнях вытворчага цэху брудна, матар'ялы пакрыты пылам, папера пабіта вагонкамі.

Тэхнічнае абслугоўваньне ў начной зьмене амаль зусім адсутнічае Бывае на вытворчасьці толькі адзін зьменны майстар. Адсутнасьць у начной зьмене адміністрацыйнага пэрсоналу ўплывае на працдысцыпліну і робіць больш частыя аварыі ў цэху.

Міліцыя слаба ахоўвае вучасткі фабрыкі. Паставыя не абходзяць свайго вучастку, а праседжваюць у будках па некалькі гадзін.

Ня ведаюць кіраўнікоў

Старшыні цэхавага камітэту і фабкому рэдка бываюць у начной зьмене, а ў некаторых аддзяленьнях зусім ня бываюць.

Чырвоныя і чорныя дошкі, якія вісяць у цэхах, не выкарыстоўваюцца, ня гледзячы на тое, што ў цэху ёсьць прыкладныя ўдарнікі, ілжэ-ударнікі, сымулянты і шкоднікі.

Партпраца кульгае. Некаторыя рабочыя нават ня ведаюць сакратароў партыйнай і камсамольскай ячэйкі. Начная зьмена пакінута без нагляду і дапамогі.

Мы п апануем:

Перагледзець заданьні ў клейнай. Захоўваць матар'ялы ў чыстаце. Умяніць у абавязак падатчыкаў матар'ялаў змазваць вагонкі. Абавязаць рольшчыкаў сачыць за падшыпнікамі. Умяніць у абавязак обэр-сетачнікам і зьменным майстрам строга сачыць за форматамі на машынах.

Патрабаваць асабістай адказнасьці цэхадміністрацыі за чыстату ў цэху. Для палепшаньня тэхабслугоўваньня, выконваньня абавязкаў рабочымі, выжыцьця аварый і падняцьця працдысцыпліны, — роўнамерна разьмеркаваць тэхпэрсанал па зьменах, устанавіўшы дзяжурства адміністрацыі ў начной зьмене.

Старшыням цэхавага камітэту і фабкому сыстэматычна бываць у начной зьмене. Узмацніць партпрацу ў начной зьмене.

Шырока выкарыстоўваць чорныя і чырвоныя дошкі. Ажывіць работу ў насьценгазэце. Практыкаваць паход патрулёў на ролы, каландры, машыны і г. д.

Брыг да: **Айнбіндэ, Лукашук, Жылінскі, Каганская.**

Прасунуць пазыку ў вёску

Некаторыя партыйныя, комсамольскія ячэйкі і культ-асьветныя ўстановы вёскі зусім не займаюцца рэалізацыяй пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады“

Шляхам соцыял стычнага спаборніцтва ячэйкі з я эйк й, сельсавету з сельсаветам забясьпечым 100 проц. падпіску на пазыку ўсяго вясковага працоўнага насельніцтва

Камсады не працуюць

Карзуноўскі сельсавет (Сьмілаўшчына) на сва м пленуме прапрацаваў пытаньне аб пазыцы „5-годка у 4 гады“, вызначыў кантрольныя лічбы для кожнай вёскі, ім был створаны камісіі садзейнічаньня (камсады) па сельсавету і ў кожнай вёсцы.

Але гэтыя камісіі не працуюць. Так, напрыклад, у вёсцы Старына камісія не вядзе ніякай працы па распаўсюджваньню пазык . Нават не занесьлі ў падпісныя лісты бедвякоў, якія падпісаліся на сходзе бедняты.

Шатэрнік

„Я пераяжджаю ў другі раён, а таму нічога не раблю“

Настаўнікі Рудзенскага сельсавету, якіх налічваецца 8 чалавек, нічога ня робяць па рэалізацыі пазыкі „5-годка—ў 4 гады“. Настаўніца Лубачайна заявіла: „Я пераяжджаю ў другі раён, а таму і нічога не раблю“.

Ганьба культурнікам Рудзенску! Настаўнікі павінны быць у першых шарагах барацьбітоў за выкананьне 5-годкі ў 4 гады, але культурнікі Рудзенску плятуцца ў хвасьце.

Рыгор Малаток.

Падпісаліся і выклікаем

Комсамольская ячэйка мястэчка Дукоры (Меншчына) шырока р згарнула працу па рэалізацыі пазыкі „5-годка ў чатыры гады“. Няма ніводнага комсамольца, які-б не падпісаўся на пазыку. Агулам ячэйка падпісалася на 200 рублёў. На агульным сходзе было ўхвалена зрабіць два суботнікі ў карысьць пазыкі і выклікаць Рудзенскую ячэйку ЛКСМ на соцспаборніцтва па падпісцы.

Адно толькі дрэнна, што ячэйка замыкаецца ў рамкі і ніякай працы па рэалізацыі пазыкі не вядзе сярод вясковай моладзі.

Ц. Л-і

***

Комсамольцы колгасу „Ленінская Беларусь“ (Мазыршчына) разам з колгасьнікамі падпісаліся на 250 руб на пазыку „5-годка ў чатыры гады“ і выклікаюць пасьледваць іхняму прыкладу ячэйку рыбнай гаспадаркі ў Жыткавічах і ячэйку пры колгасе „Чырвоны Сьцяг“ (Петрыкаўскага раёну)

Гельфанд Яўхім

***

Комсамольцы Хідранскай ячэйкі ЛКСМБ на агульным сходзе вынесьлі пастанову і колектыўна падпісаліся на пазыку „5-годка ў чатыры гады“ на суму 100 руб і выклікаюць пасьледваць гэтаму прыкладу Пухавіцкую і Турынскую ячэйкі ЛКСМБ

Клеўка

***

Комсамольская ячэйка савгасу „Горкі“ (Сьмілавіцкі раён) прыступіла да рэалізацыі пазыкі „5-годка у чатыры гады“. Абгаварыўшы на сходзе гэта пытаньне, усе комсамольцы (7 чалавек) тут-жа падпісаліся на 80 рублёў Распачынаецца праца сярод рабочых савгасу.

А. Собаль.

***

Працаўнікі Старадарожскага РВК падпісваюцца на пазыку „5-годка у чатыры гады“ на месячны заработак. Падпіска прайшла ў першы-ж дзень рэалізацыі. Усяго падпісаліся на 1525 рублёў.

Падпішчык.

***

Комсамольская ячэйка савгасу „Наталёўск“ (Меншчына) падпісаліся на пазыку ў суме 500 рублёў. Кожны комсамолец падпісаўся на 100—120% месячнага заработку.

Выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу ячэйкі: Рудня-Астравецкую і Нова-Зелянецкую.

Ладуцька.

Ці не пара ўзяцца за працу?

Насельніцтва мястэчка Мілаславічы (Магілеўшчына) да гэтага часу амаль што зусім ня ведае аб пазыцы „5-годка—у 4 гады“.

Ніякай растлумачальнай працы ні партыйнай ні комсамольскай ячэйкамі не праводзіцца.

Ці не пара зараз-жа ўзяцца за гэтую работу сярод насельніцтва Міласлаўскага сельсавету?

Шатрок.

Самадзейнае мастацтва— на службу соцбудаўніцтва

Агляд-спаборніцтва самадзейнага мастацтва

Комсамол у барацьбе за новага чалавека, за перабудову быту і за савецкае самадзейнае мастацтва заўсёды быў на перадавых позыцыях. У мастацкіх гуртках маладняк займае адно з галоўных месц як па колькасьці, так і па якасьці работы. Шмат гурткоў, якія складаюцца ў большасьці з рабочага маладняка, фактычна перарасьлі ў сапраўдныя пролетарскія тэатры. Так, напрыклад, з трам-ядраў формуюцца ТРАМ'ы, якія занаёўваюць у галіне пролетарскага тэатру сваё пэўнае месца і карыстаюцца вялікай увагай з боку рабочай грамадзкасьці.

Агляд самадзейнага мастацтва, які зараз праводзіцца па ўсім СССР, не зьяўляецца парадным мерапрыемствам, а неабходнай патрэбнасьцю ўсіх мастацкіх гурткоў, якія ў большасьці сваёй працуюць самацёкам, без належнага кіраўніцтва і мэтодычнай дапамогі як з боку профсаюзаў, так і іншых грамадзкіх організацый.

Агляд павінен праверыць кл... вы твар гурткоўцаў і кіраўні... гурткоў, выгнаўшы ўвесь чужы рэакцыйны элемэнт, уцягваючы гурткі ўдарнікаў вытворчасьці.

Аглядам практычна кіруе ... праз свае камісіі: адна па р... туару, а другая організацый... Абедзьве камісіі рэалізуюць ... шэньні штабу па агляду спа... ніцтва на падставе спэцыяльна ... працаваных інструкцый. Такія ... бы ўжо організаваны ў Менску, ... гілеве і Гомелі. У бліжэйшы-ж ... такія штабы півінны быць орг... заваны і ў астатніх гарадох.

Комсамол павінен уключыц... агляд-спаборніцтва рабочых гур... і з уласьцівай яму энэргіяй ... на перадавыя позыцыі гэтага фро...

С. В.

Уключыцца ў агляд

Зьмяшчаемы сёньня артыкул С. В. аб аглядзе-спаборніцтве мастацкіх гурткоў ставіць перад комсамолам цэлы шэраг задач.

Організаваць на заводзе, у колгасе, у клюбе гэты агляд, прыцягнуць да яго ўвагу грамадзкасьці— непасрэдная задача комсамолу.

Праверыць соцыяльны склад гурт коў, прыцягнуўшы да гэтай справы „Лёгкую Кавалерыю“; дабіцца таго, каб кожны гуртковец быў ударнікам на вытворчасьці; увязаць работу гурткоў з прадпрыемствам такім чынам, каб кожны ўдарнік, кожны рабочы ведаў аб яго існаваньні, уклаў-бы што-небудзь сваё вытворчае у ідэйны багаж гуртка; стварэньне грамадзкага контролю над работай гурткоў (абгаварэньне іх работы на сходзе комсамольцаў і рабочай моладзі), — вось асноўныя пытаньні, якія павінны ўзьняць комсамол у аглядзе спаборніцтва.

У маленькім артыкуле немагчыма ахапіць усе пытаньні агляду, тут патрэбна ініцыятыва, пры... саваньне да мясцовых умоў, ... бокая ўвага ўсёй комсамольскай ... ганізацыі да агляду—спаборні...

Мы ўжо неаднокрацць адзна... што клюбы адстаюць ад ... тэмпаў, амаль не павярнуліся ... рам да вытворчасьці, не здавал... юць вапатрабаваньняў мас. Іс... чыя юнсэкцыі павінны ня ... абслугоўваць культбытавыя ... рабаваньні моладзі, але, уклю... ца ў агульную клюбную ра... па-комсамольску хутка павяр... яе на новыя рэйкі—тварам да ... ворчасьці. Аднак, гэта толькі ... рыя пажаданьні. Нашы юнс... сьпяць летаргічным сном. Па ... ларусі 99 проц. юнсэкцый ... юць на паперы. Нават у Ме... дзе ёсьць ТРАМ на абавязку ... ляжыць дапамога юнсэкцыям ... фактычна не існуе.

Агляд-спаборніцтва мастацкіх ... коў павінен зьявіцца стымулам ... ажыўленьня работы юнсэкц... Асноўным касьцяком больш... гурткоў зьяўляецца моладзь ... юнсэкцыя скарыстоўвае гэты ... больш здаровы і моцны ка... актыў? Як уплывае яна на ... тычны рост гурткоў? І цэлы ... раг іншых пытаньняў па... быць закранутыя аглядам-спаб... цтвам.

Зараз комсамол ня толькі ... нен уключыцца ў спаборніцтва ... та мы ліч ня для яго абавязко... але і пачаць ужо па сапраў... кіраваць юнсэкцыямі.

Агляд-спаборніцтва павінен ... ажыўленьне клюбнай работы ... раўдны паварот яе тварам да ... ворчасьці, павінен ажывіць ... юнсэкцыі.

Э. ...



На здымку: Рабо ы Менскай швэйнай ф-кі „Акцябр“ тав. Левін, які абраны на міжнародную конфэрэнцыю швэйнікаў.

Адказны рэдактар— Рэдколе...

Усім піонэратрадам гор. Менску

ФРБ і КРБ ДКА паведамляе ўсім атрадам, што 18 жніўня ... гадзіне ўвечары, у памяшканьні піонэрклюбу адбудзецца сход акты... гор. Менску, на які павінны зьявіцца ўсе сябры саветаў, сябры р... колегій і г. д.

Пасьля актыву выступленьне Маскоўскага тэатру „Зацейнік“.

19 жніўня ў садзе „Профінтэрн“ адбудзецца агульна-гарадз... піонэрская масоўка па пытаньню наступленьня на ўсеагульнае на... чаньне і політэхнізацыі школы.

Пасьля—масавыя гульні, скокі, выступленьне Маскоўскага тэат... ру „Зацейнік“.

На велёдроме—кіно. Збор па фабкомах, а 4 гадзіне дня.

КРБ і ФРБ ДКА

Згублены

— Пасьведчаньне за № 12258 на імя Карэнівай Е. Б., выд. Мен. ЦП саюзу С.Г.С.

— Мэтрычны выпіс на імя Каца Аб. С., выд. Барысаўскім ЗАГС'ам.

— Пасьведчаньне аб праве н... ня зброі (рэвольвэр „Бульдог“) ... імя Баранава С. Я., выд. Д.П.У. ...

— Комсам. біл. за № 12595 і... Аусюкевіч Я. Г., выд. АК ЛКСМ...

— Комсам. біл. імя Рубенчык ... выд Барысаўскім РК ЛКСМБ.

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599